# МУЖНАСЦЬ

**На фронце я добра ведаў лейтэнанта Адама Петушкова, ураджэнца Клімавіцкага раёна. Не раз быў сведкам цяжкіх і складаных баёў, у якіх удзельнічаў гэты мужны танкіст. У кожнай схватцы з ворагам ён паказваў адвагу, знаходлівасць, баявое майстэрства, волю да перамогі.**

...Танкавы ўзвод лейтэнанта Петушкова дзейнічаў на галоўным напрамку, наступаў у перадавым атрадзе. Пры прарыве вельмі ўмацаванай абарончай паласы немцаў Петушкоў са сваім узводам на танках-тральшчыках прарабіў праходы ў мінных палях праціўніка для ўсёй часці.

Калі замініраваная мясцовасць засталася ззаду, тралы былі адчэплены ад машын, і танкісты рушылі наперад. К канцу дня танкавая рота, у саставе якой знаходзіўся ўзвод афіцэра Петушкова, уварвалася ў населены пункт Святошына, што пад Кіевам. У жорсткім баі камандзір роты атрымаў цяжкае раненне. Малады камуніст Петушкоў замяніў яго і павёў танкістаў у бой.

Супраціўленне ворага было зломлена. Працягваючы выконваць пастаўленую задачу, падраздзяленне выйшла ў тыл праціўніка, перарэзала важную дарогу, па якой адступалі немцы, і заняло кругавую абарону.

Раніцой гітлераўцы заўважылі савецкіх танкістаў і адкрылі па іх артылерыйскі агонь. Адзін танк быў выведзены са строю. Лейтэнант Петушкоў выявіў месцазнаходжанне нямецкай батарэі і ўдарыў па ёй. Першымі ж выстраламі былі знішчаны тры варожыя гарматы і аўтамашына з боепрыпасамі.

Але справа на вышыні разгарнулася другая варожая нямецкая батарэя, якая сваім агнём стрымлівала наступленне нашай пяхоты. Петушкоў прыняў рашэнне залпам усёй роты знішчыць нямецкіх артылерыстаў. Так і было зроблена. Пасля моцнага агнявога налёту танкістаў на вышыні не засталося ніводнай уцалеўшай гарматы праціўніка. Шлях пяхоце быў адкрыты.

Танкісты таксама рушылі наперад. З ходу авалодалі чыгуначнай станцыяй Баярка. Захапілі тут вялікія трафеі, у тым ліку і эшалон з танкамі і боепрыпасамі. Быў разгромлены штаб нямецкага палка.

Авалодаўшы важным у тактычных адносінах населеным пунктам Васількова, экіпажы замацаваліся на занятых пазіцыях, чакаючы падыходу асноўных сіл палка. Хутка гітлераўцы прадпрынялі ярасную контратаку з двух напрамкаў. На ўсходняй ускраіне вёскі Петушкоў застаўся са сваім экіпажам. На яго насядала каля роты гітлераўцаў пры падтрымцы дзвюх самаходных гармат.

Найбольш небяспечнымі для танкістаў былі самаходкі. Гэта зразумеў Петушкоў. Таму з месца, з-за ўкрыцця адкрыў па іх агонь.

Хутка адна з самаходак запалала. Яшчэ два выстралы – і падбіта другая самаходная гармата.

– А зараз, наперад! – падаў каманду лейтэнант свайму механіку вадзіцелю Гуміліну.

Танк на вялікай скорасці рушыў ва ўказаным напрамку, ведучы кулямётны агонь па ўцалеўшых гітлераўцах.

Камуніст Адам Захаравіч Петушкоў адважна змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Здзейсніў многа баявых подзвігаў. Радзіма па заслугах ацаніла баявыя справы вернага патрыёта, слаўнага сына зямлі Магілёўскай вобласці афіцэра Петушкова, прысвоіўшы яму званне Героя Савецкага Саюза.

**Післякоў, Д. Мужнасць / Д. Післякоў // Магілёўская праўда. — 1981. — 9 мая. — С. 2.**